**Віталь КАЧАТКОЎ**

# ШАХМАТЫ З ТРОХ ГАДОЎ






**Віталь КАЧАТКОЎ**

# ШАХМАТЫ
## З ТРОХ ГАДОЎ

Мінск
«Медысонт»
2020

УДК 794.1
ББК 75.581
К30

Малюнкі: Віталь Качаткоў

---

Выданне для вольнага часу

**КАЧАТКОЎ** Віталь Барысавіч

# ШАХМАТЫ З ТРОХ ГАДОЎ

Камп'ютарны дызайн, вёрстка: Ігар Палынскі
Дызайн вокладкі: Алег Баштавенка

Падпісана да друку 12.08.2020. Фармат 60х84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,8 . Ул.-выд. арк. 2.
Наклад 1000 экз. Заказ 13394.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў
№ 1/142 ад 09.01.2014
№ 2/34 ад 23.12.2013
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.

**ISBN 978-985-7228-95-9**

© Качаткоў В. Б., 2020
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2020

# УВОДЗІНЫ

Шахматы — не толькі геніяльная інтэлектуальная чалавечая гульня, але і магутны сродак разумовага развіцця чалавека. І не толькі дзяцей, але і дарослых!

У многіх краінах Захаду, напрыклад, у ЗША і Швецыі, шахматы ўведзены ў школьную праграму на ўзроўні прадмета. І ўжо больш за 20 гадоў школьнікі заходніх краін, дзе выкладаюцца шахматы, атрымліваюць добрую базу інтэлектуальнай гульнявой логікі з дапамогай шахмат.

Я як аўтар дадзенай кнігі, дарэчы, майстар спорту па шахматах і бацька траіх дзяцей, хачу завастрыць увагу на велізарнай магчымасці развіцця дзяцей шляхам шахматнага навучання ў дашкольным узросце. Так, так... Шахматы ўжо даступныя для разумення у трохгадовым узросце!

Я не памыліўся, і вы не недачулі. Пачынаючы з трохгадовага ўзросту, дзяцей ужо можна далучаць да свету шахмат. Але гэта, хутчэй, для вельмі развітых дзетак. Ну, а ўсім астатнім можна смела пачынаць вучыцца і гуляць у шахматы з чатырох-пяці гадоў. І ўжо да школы дзіця будзе шмат чаго ўмець у шахматах. У яго будуць развітая уседлівасць, уважлівасць і нават логіка.

Праверана на ўласных дзецях. На момант напісання кнігі старэйшы — паспяховы студэнт БДУ, дачка добра вучыцца ў ліцэі на фатографа, а самы малодшы выдатна праяўляе сябе ў вучобе, музыцы, спевах, дзюдо... І не забывае пра шахматы. Няхай мае дзеці і не стануць гросмайстрамі, але яны з выгаднага боку адрозніваюцца ад іншых дзяцей, якія не займаліся шахматамі. І гэта не хвальба, а рэальнасць.

Хай і ў вас, і вашых дзяцей усё атрымаецца. І самая галоўная парада: дзецьмі трэба займацца.

Так, вы прапусціце любімы серыял або матч, ці яшчэ ну, вельмі важную справу. Але калі вы ўсведамляеце, што вашы дзеці і ёсць самая важная справа, то тады справы, не толькі шахматныя, пойдуць угору. Любіце сваіх дзяцей. Гуляючы — займайцеся з імі. Не сварыцеся на іх. Больш хваліце. І зноў жа — больш удзяляйце ім часу. Будзе вельмі добра, калі вам на дапамогу прыйдуць бабулі і дзядулі. Паразмаўляйце з імі на гэту тэму. У бабуль і дзядуляў — больш часу, і яны больш за вас павінны любіць сваіх унукаў. Проста накарміць і даць цукерку — гэта адно. А навучыць дзіця чаму-небудзь каштоўнаму — гэта зусім іншае, класнае і неапісальнае пачуццё.

Далучыце да шахмат сваіх бацькоў. Сталым людзям у якасці прафілактыкі дэменцыі шахматы таксама рэкамендуюцца. Таму, гуляючы з унукамі ў шахматы, бабулі і дзядулі змогуць угнацца (не будзем казаць слова «заб'юць») за двума зайцамі: і ўнукам дапамогуць, і сваімі мазгамі паварушаць.

Дык вось, вы купілі кнігу і ўжо гатовыя?

Невялікая рэкамендацыя: трэба купіць шахматы! Выбірайце даволі вялікія, каб сама дошка была не менш за 40 сантыметраў і фігуры ад чатырох сантыметраў.

Мы будзем рэкамендаваць яшчэ маляваць фарбамі, алоўкамі і фламастарамі, ляпіць з пластыліну і прыдумваць яшчэ шмат розных цікавых дапаможных гульняў на аснове шахмат.

Вашы старанні акупяцца выхаваннем разумнага і годнага падрастаючага пакалення.

І галоўнае — цярпенне і адсутнасць спеху. Як казаў адзін мудры яўрэй: «Не трэба мне грошай (вы ўжо купілі кнігу) — успомніце пра мяне добрымі словамі праз пятнаццаць гадоў!».

# ПЕДАГОГАМ ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Дарагія калегі! Я вельмі цаню і паважаю вашу працу. Я разумею ступень важнасці вашых зносін з дзіцем на этапе навучання шахматам. Я таксама разумею, наколькі каштоўным будзе тое, што вы дасце першыя шахматныя веды юнаму чалавеку. Гэта важна для яго, гэта важна для краіны. Ну, а вам, паважаныя педагогі, аддзячаць, у асноўным, на нябёсах... (Жарт!)

Такім чынам, вы трымаеце ў руках гэтую невялікую і, спадзяюся, не сумную кнігу.

Нават калі вы не ўмееце гуляць у шахматы — не бяда для выкладання! Навучайцеся з гэтай кнігай і з дзецьмі разам. Дзеці не заўважаць, а вы атрымаеце невялікі кайф.

Кніга пабудаваная па ўроках. Кожны ўрок — 10-15 хвілін. Разлічаны на дзетак 4-6 гадоў. Чытаеце ўрок, хвілін за пяць-дзесяць, займаецеся з дзецьмі, і — вуаля, да канца кнігі гуляеце з дзецьмі ў шахматы!

Усіх, абсалютна ўсіх, можна і трэба навучыць! У мяне ў сям'і не ўмеюць гуляць у шахматы толькі кот Ціка і сабака Кунак. Хаця... Анекдот у тэму:

*— Сусед, мне казалі, што ваш сабака ўмее гуляць у шахматы. А вы яго называеце дурнем! Як так?!*

*— Вядома, дурны... Учора мне прайграў 3-5.*

# ЯК ПАБУДАВАНАЯ ГЭТАЯ КНІГА

Кніга складаецца з дзесяці ўрокаў. Да кожнага з урокаў прыведзеныя заданні. Пасля іх адразу ж змешчаныя варыянты адказаў.

Умоўныя абазначэнні:

⟶ – магчымы ход;

- → – магчымы вектар узяцця;

○ – поле, на якое можа станавіцца фігура;

✕ – поле, дзе адбываецца ўзяцце фігуры.



# УРОК №1

# НАЗВЫ ФІГУР. ШАХМАТНАЯ ДОШКА

Шахматных фігур не так шмат. Гэта: **кароль, ферзь, ладдзя, слон, конь** і **пешка** *(дыяграма 1)*.

Фігуры бываюць **белыя** і **чорныя.** І гэта вызначэнне — умоўнае. Больш правільна казаць пра **светлыя** фігуры і **цёмныя**, гэтак жа, як і пра палі шахматнай дошкі: светлыя і цёмныя *(дыяграма 2)*.

Да прыкладу, драўляныя шахматы звычайна маюць расфарбоўку жоўтых і карычневых фігур.




*Дыяграма 1*




*Дыяграма 2*

Дакладна такія ж фігуры і чорныя (назаві чорныя фігуры сам, па аналогіі з белымі).

Зразумела, што на дыяграме-малюнку і «ўжывую» шахматныя фігуры могуць адрозніваціца ад дызайну. Яны і ў розных кнігах, часопісах і ў інтэрнэце могуць адрозніваціца. Гэта як са шрыфтамі. Але ўсе фігуры лёгка пазнавальныя. Часам у пачаткоўцаў бывае блытаніна з каралём і ферзём. Але гэта блытаніна з досведам праходзіць.

# ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №1

Вывучыце назвы фігур і вызначайце іх па форме, малюнку, навобмацак.

Намалюйце або зляпіце з пластыліну шахматныя фігуркі. Хай дзіця вызначае і называе іх па чарзе і па колеры.

Выражце аднолькавыя квадрацікі (палі шахматнай дошкі) з кардону двух колераў — цёмныя і светлыя. Няхай дзеці навучацца правільна складаць з квадрацікаў (або кубікаў) элементы шахматнай дошкі.

Намалюйце элементы шахматнай дошкі (частку дошкі, неабавязкова ўсю дошку) і фігуры на ёй.

Хай дзіця навучыцца ставіць фігуры і маляваць фігуры на дошцы — строга ў цэнтры поля, светлага ці цёмнага.

Гульня «Чароўны мяшочак». Вазьміце непразрысты мяшочак. Пакладзіце якую-небудзь шахматную фігуру. Хай дзіця навобмацак вызначыць фігуру і скажа яе назву.

Проста дайце дзецям пагуляць у шахматныя фігуркі. Хай яны іх мацаюць, бяруць у рукі, прывыкаюць.

Пагуляйце з дзецьмі ў школу. Хай адно дзіця будзе настаўнікам, а другое — вучнем. Настаўнік паказвае фігуру, а вучань кажа, як яна называецца. Настаўнік прымае адказ і вызначае, правільна ці не. Калі займаецеся індывідуальна з дзіцем, паспрабуйце стаць вучнем. Адмыслова рабіце памылкі — хай юны шахматыст вас выпраўляе.

Адказвайце «правільна», калі дзеці навучацца без памылак вызначаць і называць фігуры: белы слон, чорны конь, чорны ферзь, белы кароль, белая пешка і г.д.



# УРОК №2
# ЛАДДЗІ ХОДЗЯЦЬ І Б'ЮЦЬ

**Ладдзя заўсёды ходзіць прама — запомні!**
**І б'е яна прама — упартая вельмі.**
**Ладдзя — упартая, і ходзіць — прама.**

У шахматнай мове існуюць паняцці: вертыкалі і гарызанталі. Дзецям запомніць гэта цяжка, таму замацавалася паняцце — ходзіць «прама», ходзіць «наўскасяк». Дык вось ладдзя ходзіць прама, прычым можа як на адну клетку, так і прама на край дошкі. Можна і трэба казаць дзецям правільнай мовай: ладдзя ходзіць па вертыкалях і гарызанталях. Ці зразумеюць яны гэтую мову? Лічу, што трэба чаргаваць прастамоўі з пісьменнай мовай.



*Дыяграма 3*

**Заданне.** Чорная ладдзя за адзін ход можа пайсці на любое поле, якое было адзначана зорачкай *(дыяграма 3)*. Пакажы, куды можа пайсці белая ладдзя за адзін ход.

Можна алоўкам адзначыць крыжык, куды можа пайсці белая ладдзя. Расстаўце рэальныя шахматныя фігуры на рэальнай шахматнай дошцы. Пагуляйце з дзіцем. Хай яно ходзіць белай ладдзёй, а вы — чорнай. Рабіце па чарзе хады — белыя, потым чорныя і г.д. Потым памяняйцеся колерам фігур. Калі дзяцей двое, то няхай адзін ходзіць белай ладдзёй, а другі чорнай. Сачыце за правільнасцю хадоў. Дзеці павінны ставіць фігуры бліжэй да цэнтра шахматнага поля, адрываць руку і такім чынам перадаваць ход партнёру.

Адказ — на *дыяграме 4.* І чорная, і белая ладдзя пры сваім ходзе могуць пабіць фігуру супрацьлеглага колеру, калі яна, фігура, трапіцца на шляху.

Прыклад — на *дыяграме 5.*

Чорная ладдзя пры сваім ходзе можа пабіць або белую пешку, або белага каня. Але, да прыкладу, белага слана яна пабіць за адзін ход не можа. Белы слон стаіць за канём, а пераскокваць ладдзя не ўмее.

Белая ладдзя пры сваім ходзе можа пабіць любога чорнага слана, на выбар чорную пешку або чорнага каня. А вось пешку, якая стаіць за канём, яна



*Дыяграма 4*



*Дыяграма 5*

пабіць не можа. Чорны конь як бы прыкрывае чорную пешку сваімі грудзьмі.

Узяцце ў шахматах адбываецца так: пабітая фігура прыбіраецца з дошкі, а на яе месца ставіцца фігура, якая б'е.

Прыклад — *дыяграма 6.*



*Дыяграма 6*

Чорная ладдзя пабіла белага каня.

Белая ладдзя пабіла чорнага каня.

Памятайце, у шахматах саапернікі робяць хады па чарзе.

**Заданне.** Пасадзіце дзяцей насупраць адно аднаго. Абвясціце аднаго правадыром белых фігур, а другога — чорных. Аднаму вучню пастаўце на дошку чорную ладдзю, а другому — белую.

Хай ходзяць правільна па чарзе ладдзямі. Прасачыце за правільнасцю хадоў. Той, хто саб'е чужую ладдзю, — той выйграў. Калі дзеці досыць натрэніруюцца хадзіць адной ладдзёй, дадайце яшчэ пару ладдзей. Сачыце, каб юныя шахматысты рабілі хады правільна, а не хадзілі ладдзямі наўскасяк, убок, сачыце, каб юныя шахматысты ставілі фігуркі ў цэнтр палёў, правільна збівалі чужыя ладдзі.

**Заданні да ўрокаў.** Шахматная дошка ў дадатковых задачах падзеленая на чатыры фрагменты. Усе задачы ў гэтых фрагментах — самастойныя, і іх можна і трэба рашаць асобна ад іншых. Падзел дошкі на фрагменты мае дзве мэты — эканомія шахматнага матэрыялу і старонак кнігі, і самую галоўную мэту: дзеці ў пачатку шахматнага шляху не бачаць усю дошку, і іх ўвага сканцэнтравана ў асноўным на фрагментах дошкі і малой колькасці фігур. Ад вялікай колькасці фігур дзіця губляецца.

## ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №2

Нападзі белай ладдзёй на чорную фігуру *(дыяграма 7)*. Калі заданне будзе выконвацца ў кнізе-сшытку, то можна намаляваць алоўкам маршруты фігур (хады фігур) стрэлкамі. Фігуры, якія магчыма пабіць, можна пазначыць крыжыкам.

Выберы ахвяру для чорнай ладдзі і збі яе *(дыяграма 8)*.



*Дыяграма 7*



*Дыяграма 8*

# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №2



*Адказы да дыяграмы 7*



*Адказы да дыяграмы 8*



# УРОК №3
# СЛОН



*Дыяграма 9*

Калі ўмееце гуляць у шашкі, то хады слана можна параўнаць з шашачнай дамкай. Адрозненне ў тым, што ў шашках для барацьбы выкарыстоўваюцца толькі чорныя палі, а ў шахматах — усе: і белыя, і чорныя. Таму і сланы бываюць і белапольныя, і чарнапольныя. На *дыяграме 9* намаляваны белы белапольны слон.



*Дыяграма 10*



*Дыяграма 11*

Другое адрозненне шахмат ад шашак — ва ўзяцці. У шашках фігура, якая б'е, пераскоквае бітую, а ў шахматах — становіцца на яе месца. Ёсць яшчэ важкае правіла ў шахматах — біць неабавязкова!

Дык вось — слон. Расстаўляем падобныя пазіцыі *(дыяграмы 10, 11)* і гуляем з дзіцем у сланоў.

Сочым, каб дзіця правільна рабіла хады па дыяганалі (наўскасяк), не пераскоквала з дыяганалі на дыяганаль. Рабіце хады па чарзе: адзін ход — дзіця, адзін ход — вы. Падстаўляйце «пад бой» дзіцяці свайго слана. (Проста ўмейце паддавацца!) Калі яно не заўважыла — укажыце яму на памылку. Не сварыцеся — толькі хваліце!

Калі дзіця засвоіць гульню з адным сланом, дадайце іншага *(дыяграмы 12, 13)*.



*Дыяграма 12*



*Дыяграма 13*

Калі ласка, толькі не спяшайцеся! Дзеці могуць займацца 5-10 хвілін. Падрыхтаваныя вундэркінды — максімум 15 хвілін. Галоўнае — рэгулярнасць заняткаў!

# ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №3

Нападзі белым сланом на ладдзю. Разыграйце пазіцыю.

1. Нападзі сланом на ладдзю *(дыяграма 14)*.

2. Разыграйце фрагменты. Ход — белых *(дыяграма 15)*.



*Дыяграма 14*



*Дыяграма 15*

Гэта ўжо міні-партыя ў шахматы. Расстаўце фігуры на дошцы. Можна выкарыстаць усю шахматную дошку, а не толькі яе фрагменты, як паказана на дыяграме. Хтосьці хай ходзіць белымі, іншы возьме на сябе чорныя фігуры. Зрабіце, напрыклад, па дзесяць хадоў белымі і чорнымі фігурамі.

## АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №3



*Адказы да дыяграмы 14*



*Адказы да дыяграмы 15*





# УРОК №4
# СЛОН + ЛАДДЗЯ. ТУРНІРЫ

Замацоўваем разуменне дзеянняў-хадоў ладдзі і слана. Разыгрываем пазіцыі: ладдзя супраць слана, сланы супраць ладдзі і г.д. Пагуляйце з дзіцем у «ладдзю і слана» *(дыяграмы 16, 17, 18, 19)*. Хай яно ходзіць ладдзёй, а вы — сланом. Потым памяняйцеся ролямі. Задайце юнаму шахматысту пытанне: хто мацнейшы?



*Дыяграма 16*



*Дыяграма 17*



*Дыяграма 18*



*Дыяграма 19*

Можаце даць яшчэ інфармацыю на будучыню. У шахматным свеце ёсць свая валюта. І гэта не рублі, долары або еўра. У шахматнай гульні ўсё вымяраецца ў… пешках. Гэта самая маленькая адзінка ў шахматах. Да яе вывучэння мы яшчэ прыйдзем пазней. Дык вось: ладдзя каштуе каля **пяці** пешак, а слон — **тры** пешкі. Потым мы яшчэ будзем разбіраць гэта на прыкладах і растлумачваць. Пакуль гэта можна даведацца як факт: ладдзя = 5, слон = 3. З гэтага, напрыклад, выходзіць найпрасцейшая шахматная матэматыка. Два сланы — гэта 3 + 3 = 6, у суме — больш, ці мацней, за адну ладдзю.

Дзеці вельмі любяць спаборнічаць. Тут і плюсы, і мінусы. Плюсы — гэта адрэналін, добрая гульнявая практыка, спаборніцкі элемент у педагогіцы, прычым ацэнкі ставяць сабе дзеці: перамог — значыць, малайчына, прайграў — усё вельмі дрэнна. Мінусы — маленькія і вялікія драмы. Як і ў любым спорце — слёзы і перажыванні. Што сказаць? Якраз тут і пачынае выхоўвацца характар. Хтосьці пасля першых няўдач апускае рукі… Задача настаўніка, трэнера, педагога, аднаго з бацькоў — падтрымліваць, падбадзёрваць усіх! Асабліва тых, хто прайграў. Бо ім вельмі цяжка і крыўдна. Не сварыцеся, а наадварот, па магчымасці, хваліце. Кажыце: рабіў добрыя хады, але вось тут «пазяхнуў», у наступны раз абавязкова пераможаш! І гэтак далей. Неабходна ўсталёўваць максімальную колькасць «пернікаў» (прызоў) у дзіцячых турнірах.

Такім чынам, пра турніры і метады іх правядзення.

Самы просты і папулярны метад правядзення спаборніцтва — шахматны турнір па кругавой сістэме. Кожны гуляе з кожным. Чэрціце табліцу і праводзіце турнір. У пачатковых дзіцячых турнірах неабавязкова прытрымлівацца строгага пачатку і заканчэння партый па часе. Пачалася партыя, скончылася партыя — дзеці падыходзяць і кажуць вынік, вы гэты вынік заносіце ў табліцу і свабодных партнёраў садзіце за новую партыю.

| № | Удзельнік | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | Ачкі | Месца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дзянісёнак | | 0 | 1 | 1 | 1 | 1/2 | $3^{1/2}$ | 1 |
| 2 | Кудрыцкі | 1 | | 1/2 | 0 | 0 | 1/2 | 2 | 5-6 |
| 3 | Адамовіч | 0 | 1/2 | | 0 | 1 | 1 | $2^{1/2}$ | 2-4 |
| 4 | Кавалёў | 0 | 1 | 1 | | 0 | 1/2 | $2^{1/2}$ | 2-4 |
| 5 | Пінчук | 0 | 1 | 0 | 1 | | 1/2 | $2^{1/2}$ | 2-4 |
| 6 | Барысенка | 1/2 | 1/2 | 0 | 1/2 | 1/2 | | 2 | 5-6 |

Вышэй прыведзены прыклад такой таблічкі на 6 удзельнікаў, з няскончаным турнірам. Думаю, што калі ўважліва прыгледзіцеся да табліцы, лёгка самі ўсё зразумееце і разберацеся. Адзінку атрымлівае той, хто выйграў, палавінка — нічыя, нулік — той, хто прайграў. У канцы турніру падлічваем ачкі і вызначаем пераможцу турніру.

Можна праводзіць турніры, ужо проста засвоіўшы хады сланом і ладдзёй. Расставілі фігуры на дошцы, і няхай дзеці ходзяць, гуляюць і выйграюць. Можаце называць турніры турнірамі ладдзей, сланоў, коней, пешак. Прысвячаць турніры святам. Табліцы потым можна падарыць бацькам.

Можаце падпісаць турнір, напрыклад: «Шахматны турнір «8 Сакавіка», пазначыць месца правядзення, дату, унізе табліцы напісаць, хто быў суддзёй, паставіць пячаткі, размножыць і падарыць бацькам.

## ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №4

Ладдзя супраць слана, слон супраць ладдзі.

1. Збі чорным сланом ладдзю.
2. Нападзі белай ладдзёй на чорнага слана.
3. Разыграйце гэтыя фрагменты партый. Першы ход — белых.



*Дыяграма 20*

# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №4



*Адказы да дыяграмы 20*

Лепшыя ходы – нападзенні ў пазіцыі за белых адзначаныя ў дыяграме.




Хто я?!
Прывітанне!
А я?

# УРОК №5
# ФЕРЗЬ

**Ферзь — самая моцная і магутная фігура.** Па-простаму хады ферзя можна растлумачыць так: гэта ладдзя плюс слон. Ферзь можа хадзіць і біць і як ладдзя, і як слон *(дыяграма 21).*



*Дыяграма 21*



*Дыяграма 22*

У дадзенай пазіцыі белы ферзь можа перамясціцца на любую клетку і па гарызанталі, і па вертыкалі, і па дыяганалях. Ферзь можа пайсці на любую з клетак, пазначаных лініямі.

На пазіцыі, адзначанай на *дыяграме 22,* белы ферзь можа пабіць (ажыццявіць узяцце) любую з чорных фігур. Але гэта не значыць, што ён можа пабіць усе фігуры. Ферзь можа пабіць за адзін ход любую фігуру, не болей. Але можа, калі захоча, і не біць. У шахматах «біць» (узяцце) неабавязкова.

Пагуляйце ў гульні «Ферзь супраць ферзя», «Ферзь супраць слана», «Ферзь супраць ладдзі», «Ферзь супраць ладдзі і слана», «Ферзь супраць дзвюх ладдзей і слана», «Ферзь супраць дзвюх ладдзей і двух сланоў». Можаце правесці тэматычныя шахматныя турніры.

# ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №5

Нападзі ферзём на ладдзю, каб ладдзя не змагла збіць ферзя (па дыяганалі).

Нападзі ферзём на слана, каб слон пры сваім ходзе не змог збіць ферзя (па вертыкалі або гарызанталі).

Разыграйце гэтыя пазіцыі *(дыяграма 23)*. Зладзьце турнір. Сачыце, каб дзеці не блыталі хады фігур.



*Дыяграма 23*

Мы засвоілі ўжо тры фігуры: слана, ладдзю і ферзя. Гэта роўна палова. Засталіся яшчэ кароль, конь і пешка. Трэніруйцеся і назірайце, каб дзеці не блыталі назвы фігур і тое, як яны ходзяць.



# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №5



*Адказы да дыяграмы 23*



# УРОК №6
# ФРАГМЕНТЫ ШАХМАТНАЙ ДОШКІ. ШАХМАТНЫЯ ЗАДАЧЫ

На пачатковым этапе навучання шахматам не толькі дзеці, але і дарослыя пачаткоўцы могуць дазволіць сабе бачыць шахматную дошку толькі фрагментамі. Бачанне шахматнай дошкі цалкам прыходзіць з часам. Пастаянна сачыце за ракурсам, пад якім дзеці глядзяць на дошку. З-за маленькага росту дзеці часта папросту ледзь не кладуцца каля дошкі і спрабуюць нешта бачыць. Магчыма, яны ўжо стаміліся і варта спыніць заняткі. Ракурс павінны быць такі: заўсёды максімальны позірк зверху.

**Пра фрагменты.** Можна паспрабаваць разрэзаць шахматную дошку на чатыры часткі і даваць невялікія задачы на фрагментах. Гэта дазваляе зэканоміць на шахматным правіянце. Калі ў вас на першым этапе восем вучняў і не хапае шахмат і дошак, то фрагменты дошкі можна раздрукаваць на прынтары і спрасціць некаторае разуменне задач для дзяцей.

**Задачы па шахматах.** Акрамя гульнявой практыкі, карысна вырашаць шахматныя задачы. У кожнай задачцы крыецца нейкая ідэя. Ніжэй прапаную вырашыць задачы, якія паказаны на фрагменце дошкі. Вы можаце



*Дыяграма 24*

іх расставіць дзецям і на ўсёй дошцы. Рашыць задачу з кнігі, не расстаўляючы яе на рэальнай дошцы з рэальнымі фігурамі, яшчэ цяжэй.

У прыведзеных прыкладах *(дыяграмы 24, 25)* вучань павінны зрабіць лепшы ход. Можна згуляць як белымі, так і чорнымі. У асноўным, у задачах ўжо трэніруюцца навыкі нападу і двайнога ўдару. На фрагментах дошкі можна не толькі рашаць задачы, але і гуляць.



*Дыяграма 25*

## ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №6



*Дыяграма 26*



*Дыяграма 27*

Нападзі ладдзёй на дзве фігуры *(дыяграма 26)*.

Нападзі сланом на дзве фігуры (зрабі «відэлец», *дыяграма 27*).

«Відэльцам» называецца двайны ўдар у шахматах. Гэта калі адна фігура нападае адразу на дзве фігуры.



*Дыяграма 28*

Правядзі двайны ўдар ферзём — пастаў «відэлец» ферзём на слана і ладдзю *(дыяграма 28)*. Сачы за тым, каб ферзь сам не апынуўся пад боем слана або ладдзі.

Можаце паўтараць і вырашаць гэтыя задачы па некалькі разоў. Калі ў юных шахматыстаў не атрымліваецца — дапамажыце. Рухайцеся наперад, і ў вас усё атрымаецца!



# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №6



*Адказы да дыяграмы 26*



*Адказы да дыяграмы 27*



*Адказы да дыяграмы 28*

# УРОК №7 ПЕШКА





Дыяграма 29

З пешкамі і лёгка, і цяжка. Ходзяць прама, б'юць наўскасяк *(дыяграма 29)*. Плюс, калі даходзяць да восьмай гарызанталі, ператвараюцца ў любую фігуру, але часцей за ўсё ў наймацнейшую — ферзя. Звальваць усю гэту інфармацыю на дзіця адразу — парушыць псіхіку. Пачнём з малога — ходзіць прама, б'е наўскасяк. Так, калі яшчэ на першым уроку распавесці пра правіла «ўзяцце на праходзе», калі іншы раз дзеці і пасля некалькіх гадоў заняткаў яго не засвойваюць... Тады сапраўды можна ўжо далей нічога не распавядаць. Зноў жа: бяром у дапамогу фрагменты дошкі — і паказваем, задаём пытанні, атрымліваем, выпраўляем, паказваем, і... гуляем, гуляем, гуляем!

Як можа пайсці або пабіць пешка (белая, а потым і чорная; *дыяграма 30*)?



Дыяграма 30

І ўжо пасля разбору «палётаў» — тэматычны турнір на замацаванне хадоў пешкі. Глядзіце! У нас у арсенале ёсць ужо чатыры фігуры, і мы ўжо можам, у прынцыпе, разыграць даволі складаную пазіцыю *(дыяграма 31)*.

Але можна і прасцей. З пазіцый, пазначаных на *дыяграмах 32 і 33*, правядзіце серыю турніраў.

Такіх пазіцый можна прыдумваць вялікае мноства. Галоўнае, каб дзецям было цікава гуляць і яны правільна рабілі хады фігурамі. Дзеці павінны імкнуцца нападаць на фігуры саперніка і, калі тыя бу-

дуць пад боем, правільна збіваць. Перамагае той, хто саб'е ўсе фігуры саперніка. Калі дзеці добра нападаюць, правільна адводзяць свае фігуры ад бою — смела давайце абодвум саапернікам па адным ачку. Калі бачыце, што ў дзіцяці ўсё атрымалася добра, — дайце два ачкі, і г.д.

Асобна пра сістэму заахвочванняў. Зрабіце шмат-шмат розных заахвочвальных сонейкаў, зорачак з кардону. Раздавайце дзецям за добрыя хады, партыі, правільныя рашэнні і г.д.

У канцы ўрока можаце сабраць, усё палічыць і ўсіх-усіх пахваліць! Дзеці вельмі любяць, калі іх хваляць. Не забывайце пра гэта.



*Дыяграма 31*



*Дыяграма 32*



*Дыяграма 33*

## ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №7

Нападзі пешкай на дзве фігуры, на шахматнай мове — правядзі двайны ўдар, або зрабі відэлец пешкай.



*Дыяграма 34*

## АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №7



*Адказы да дыяграмы 34*



# УРОК №8
# ПЕРАТВАРЭННЕ ПЕШКІ Ў ФЕРЗЯ

Пешка, калі даходзіць да канца дошкі, аўтаматычна, у той жа ход, чароўным чынам ператвараецца ў любую фігуру *(дыяграма 35)*.




*Дыяграма 35*



*Дыяграма 36*

Разыграйце тэматычны турнір — «Пешачны эндшпіль». Эндшпіль — заканчэнне. Выйграе той, хто першым правядзе любую пешку ў ферзі. Варыянты пачатковага размеркавання – на *дыяграме 36*.



## ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №8

Правядзі белую пешку ў ферзі *(дыяграма 37)*.

Прарвіся белай пешкай у ферзі *(дыяграма 38)*.



*Дыяграма 37*



*Дыяграма 38*

## АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №8



*Адказы да дыяграмы 37*



*Адказы да дыяграмы 38*

# УРОК №9
# КОНЬ



*Дыяграма 39*



*Дыяграма 40*

Конь — самая складаная для разумення дзіцяці фігура. Калі спрасціць, конь ходзіць літарай «Г». Дыдактычна дзіцяці можна растлумачыць ход канём словамі з мультфільма «Маша і Мядзведзь»: два разы прама і ўбок скок. Можна тлумачыць: адзін прама і адзін наўскасяк, або адзін наўскасяк і адзін прама *(дыяграма 39)*.

Ёсць яшчэ шмат варыянтаў замацавання разумення ходу канём, але будзьце цярплівыя: некаторым дзецям для добрага запамінання і разумення ходу канём патрэбныя месяцы. Проста паўтарайце і гуляйце.

Пастаўце каня на любое шахматнае поле. Дайце дзіцяці, напрыклад, кардонныя кружкі. Хай на тыя палі, куды можа пайсці конь, дзіця пакладзе гэтыя кружкі *(дыяграма 40)*.

Пастаўце белага каня на любое шахматнае поле. Размясціце некалькі чорных фігур так, каб адна была пад боем. Хай дзіця само знойдзе, каго конь можа збіць.



# ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №9

Рашыце шахматныя задачы *(дыяграмы 41, 42)*. Каго конь можа збіць?



*Дыяграма 41*



*Дыяграма 42*

Знайдзі фігуру, якую можа пабіць белы конь *(дыяграма 43)*. Пабі яе!

Знайдзі ахвяру для чорнага каня *(дыяграма 44)* і збі яе!



*Дыяграма 43*



*Дыяграма 44*

# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №9



*Адказы да дыяграмы 41*



*Адказы да дыяграмы 42*



*Адказы да дыяграмы 43*



*Адказы да дыяграмы 44*



# УРОК №10
# КАРОЛЬ



*Дыяграма 45*



*Дыяграма 46*

Вось і падышлі мы да караля. Чаму караля вывучаем самага апошняга? Кароль — асаблівы. Яго не б'юць, але яму даюць мат. Паняцце мату — цяжкае для разумення дзіцяці. Але гэта — пасля. У пачатку вывучым, як ходзіць і б'е кароль. І можна проста растлумачыць дзіцяці, што караля страціць нельга. Яго трэба берагчы.

Дык вось: кароль ходзіць і б'е на адну клетку *(дыяграма 45)*.

Пастаўце фігуру караля на любую клетку. Хай дзіця раскладзе кардонныя кружкі на месцы, куды кароль можа пайсці.

**Кароль не можа хадзіць пад бой чужых фігур.**

Расстаўце дыяграму і раскажыце, што могуць у ёй зрабіць пры сваім ходзе белы кароль і чорны.



# ЗАДАННІ ДА ЎРОКА №10

Куды можа пайсці кароль *(дыяграма 47)*?

Каго можа збіць кароль *(дыяграма 48)*?



*Дыяграма 47*



*Дыяграма 48*

Знайдзі ахвяру для белага караля *(дыяграма 49)*. Збі яе.

Куды пайсці чорнаму каралю *(дыяграма 50)*?



*Дыяграма 49*



*Дыяграма 50*

# АДКАЗЫ ДА ЎРОКА №10



*Адказы да дыяграмы 47*




*Адказы да дыяграмы 48*

**Каментары да дыяграмы 48**

а) Чорны кароль можа пабіць белую ладдзю. Пешку — не можа, бо яе абараняе белая ладдзя.

б) Кароль можа пабіць толькі чорнага каня, бо той нікім не абаронены.

в) Кароль можа пабіць безабаронную ладдзю. Конь абаронены ладдзёй.

г) Кароль можа пабіць толькі слана. Конь абаронены сланом.






*Адказы да дыяграмы 49*



*Адказы да дыяграмы 50*

**Каментары да дыяграмы 49**

а) Кароль можа пабіць ладдзю. Пешка абаронена ладдзёй.

б) Кароль можа пабіць слана. Ладдзя абаронена сланом.

в) Кароль можа пабіць слана. Ладдзю — не, яна абаронена сланом.

г) Кароль можа пабіць толькі ладдзю. Усе астатнія фігуры абароненыя.



# ЗАКЛЮЧЭННЕ



Вось мы і завяршылі гэты пачатковы курс шахмат. Падарожжа толькі пачынаецца!

Дзеці яшчэ не ведаюць усе правілы гульні. Узяцце на праходзе, ракіроўка…

Хутчэй за ўсё, вы, як добрыя педагогі, раскрыеце ім і гэтыя сакрэты і правілы, і іншыя.

Што далей? Толькі наперад!

Гуляць у шахматы, ладзіць турніры, выйграваць і зноў гуляць!

Сучасных дзяцей варта вучыць таму, як трэніраваць памяць, утрымліваць увагу, як класіфікаваць інфармацыю і дзе шукаць тую, якой можна верыць, як паводзіць сябе ў сітуацыі бясконцага стрэсу і недахопу часу.

Вельмі цікавая пазіцыя па гэтым пытанні прафесара Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, загадчыцы кафедры праблем канвергенцыі натуральных і гуманітарных навук, кіраўніка лабараторыі кагнітыўных даследаванняў, доктара філалагічных і біялагічных навук Таццяны Чарнігаўскай. На думку вучонага, выкладчык або настаўнік, які проста прыходзіць выкладаць веды, — не патрэбны. Патрэбны вірусны выкладчык. Дзецям чамусьці павінна стаць цікава тое, што мы ім прапануем. Калі ім не цікава, няма чаго траціць на гэта час і грошы — пустая справа!

Выкладаць павінны людзі, якія не проста даносяць нейкую інфармацыю, але тлумачаць, каментуюць, правакуюць, выклікаюць на дыялог, узбуджаюць пратэст, гуляюць.

Па словах эксперта, калі адкрыць чарапную каробку, наўрад ці там можна ўбачыць, дзе ляжаць назоўнікі, дзе — прыметнікі, дзе конь, дзе ферзь, дзе шах, дзе мат.

Можа, дзяцей варта вучыць таму, як «трымаць» памяць, увагу, як класіфікаваць інфармацыю, як здабываць тую інфармацыю, якой можна верыць, як паводзіць сябе ў сітуацыі бясконцага стрэсу і цэйтноту. Як не баяцца сказаць, што думаеш, нават калі тваё меркаванне не супадае з агульнапрынятым? Бо хіба не гэта — шлях да адкрыццяў?!

Патрэбныя людзі з адкрытай свядомасцю, у якіх расплюшчаныя вочы, вушы ўслухоўваюцца, нос прынюхваецца. Патрэбныя мазгі, не залепленыя пластылінам. І наша задача, задача адукацыі, — развіваць гэтыя мазгі далей, а не душыць іх.

Што далей? Вучыць, гуляць, развіваць, распавядаць, паказваць, камунікаваць… і зноў вучыць!

**З павагай да ўсіх бацькоў, педагогаў і іх адораных дзяцей,**
**Віталь Качаткоў.**

*Мой электронны адрас на ўсялякі выпадак:* ***Kochet@tut.by.***



# ДАДАТАК
# ЯК ХОДЗЯЦЬ ШАХМАТНЫЯ ФІГУРЫ



**Слон**



**Ладдзя**



**Ферзь**



**Кароль**



**Пешка**



**Конь**



# ЗМЕСТ


Уводзіны ........................................ 3
Урок №1. Назвы фігур. Шахматная дошка ........................................ 6
Урок №2. Ладдзі ходзяць і б'юць ........................................ 8
Урок №3. Слон ........................................ 12
Урок №4. Слон + Ладдзя. Турніры ........................................ 16
Урок №5. Ферзь ........................................ 21
Урок №6. Фрагменты шахматнай дошкі. Шахматныя задачы ........................................ 24
Урок №7. Пешка ........................................ 28
Урок №8. Ператварэнне пешкі ў ферзя ........................................ 32
Урок №9. Конь ........................................ 34
Урок №10. Кароль ........................................ 38
Заключэнне ........................................ 42
Дадатак. Як ходзяць шахматныя фігуры ........................................ 44
Змест ........................................ 46





В. КОЧЕТКОВ
ЗАДАЧИ ПО ШАХМАТАМ
МАТ В ОДИН ХОД


Тактика
для начинающих
чемпионов
YouTube
Видео
с разъяснениями
задач из книги


В. КОЧЕТКОВ
ШАХ и МАТ
ЗАДАЧИ ПО ШАХМАТАМ 5

В. КОЧЕТКОВ
ШАХ и МАТ
В. КОЧЕТКОВ
ЗАДАЧИ ПО ШАХМАТАМ
МАТ В ОДИН ХОД
Шукайце
гэтыя кнігі
ў крамах
ААТ «Белкніга»



**Віталь Качаткоў — майстар спорту Рэспублікі Беларусь па шахматах**

**З найбольш значных шахматных перамог:**

• Віцэ-чэмпіён свету сярод непрафесіяналаў у Англіі (Гастынгс, 1999-2000 г.)
• Віцэ-чэмпіён Рэспублікі Беларусь (2002 г.)
• Суперфіналіст фестывалю «Кубак Стакгольма» па хуткіх шахматах (Швецыя, 2007 г.)
• Прызёр і пераможца абласных, рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў

**Найвышэйшы рэйтынг FIDE — 2430.**

**Электронная пошта аўтара: kochet@tut.by**



ISBN 978-985-7228-95-9
9 789857 228959